# АБ ТЭНДЭНЦЫЯХ РАЗВІЦЦЯ СУЧАСНАЙ ДЗЯРЖАВЫ І ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА ВА ЎМОВАХ ІНФАРМАЦЫЙНАЙ ПРАСТОРЫ

**Д. А. Лагун**

Сучасную дэмакратычную прававую дзяржаву немагчыма ўявіць без прызнання і абароны натуральных правоў чалавека, якія лічацца неад'емнымі, неадчужальнымі, прыналежнымі асобе з моманту нараджэння. Гэтыя правы надаюцца чалавеку не дзяржавай, а ў сілу таго, што ён па прыродзе чалавек (свецкі накірунак тэорыі натуральнага права), ці ў сілу Божай волі (рэлігійны накірунак тэорыі натуральнага права).

Натуральныя правы выступаюць найбольш важнымі і ўзначальваюць іерархію правоў і свабод чалавека і грамадзяніна, да якіх таксама адносяць палітычныя, эканамічныя, сацыяльныя, культурныя, гуманітарныя правы. Таму прававой аксіёмай з’яўляецца палажэнне аб тым, што дзяржава не прадастаўляе чалавеку натуральныя правы і не можа пазбавіць яго гэтых правоў. Асноўнае прызначэнне дзяржавы гарантаваць магчымысць выкарыстання асобай натуральных правоў і абараняць іх ад парушэння. Прызнаецца, што дзяржава можа абмяжоўваць натуральныя правы толькі на падставе прававога закона дзеля забеспячэння натуральных правоў і свабод іншых асоб, аховы здароўя, абароны маральнасці, нацыянальнай бяспекі і грамадскага парадку, а таксама на падставе прыгавору (пастановы) суда за ўчыненае злачынства або адміністрацыйнае правапарушэнне.

У навуковай літаратуры зазначаецца немагчымасць даць вычарпальны пералік натуральных правоў, што звязана са спрэчнымі поглядамі адносна некаторых з іх. Разам з тым, да натуральных правоў (часам іх называюць асабістымі, або грамадзянскімі, правамі) безумоўна, адносяць права на жыццё, уласную свабоду, недатыкальнасць асобы (яе гонару і годнасці), яе прыватнага жыцця, недатыкальнасць жылля, тайну карэспандэнцыі, у тым ліку, электроннай перапіскі праз Інтэрнэт, тэлефонных перамоў, якія ажыццяўляюцца праз стацыянарную, мабільную сетку ці пры дапамозе іншых сродкаў камунікацыі, на свабоду слова, сумлення і веравызнання, свабоду перамяшчэння і выбару месца жыхарства, прэзумпцыю невінаватасці, права не сведчыць супраць сябе і сваіх родных.

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 года [1] (далей – Канстытуцыя) прызнала чалавека, яго правы і свабоды вышэйшай каштоўнасцю грамадства і дзяржавы. Яна замацавала натуральныя правы чалавека, асноўныя гарантыі іх раэлізацыі, умовы абмежавання.

Згодна з арт. 63 Канстытуцыі прыпыненне дзейнасці натуральных правоў дазваляецца толькі на падставе прававога закона і толькі ў перыяд надзвычайнага ці ваеннага становішча. Пры гэтым права на жыццё, на свабоду, недатыкальнасць і годнасць асобы, свабоду сумлення і веравызнання, прынцып прэзумпцыі невінаватасці не могуць быць прыпынены ні ў якім выпадку.

Такім чынам, натуральныя правы, з аднаго боку, забяспечваюць недатыкальнасць чалавека, яго жыцця, жылля, годнасці, перамоў і перапіскі, а з другога, самі з’яўляюцца недатыкальнымі, не падлягаюць у звычайных абставінах адмене, абмежаванню, прыпыненню.

Недатыкальнасць прыватнага жыцця гарантуе асобе аўтаномнасць, незалежнасць яго светапогляду, магчымасць самавыяўлення, нацыянальную, сацыяльную, культурную, эканамічную самаідэнтыфікацыю, развіцце талентаў, шматграннае праяўленне яго творчых, духоўных пачаткаў, задавальненне ўнутраных патрэбнасцяў і інтарэсаў. Сутнасць недаты-

кальнасці прадугледжвае, што менавіта асоба вызначае аб'ём яе рэалізацыі ў сваім жыцці і інфармаванне іншых асоб аб гэтым: карыстацца або не карыстацца свабодай перамяшчэння, дазваляць або не дазваляць уваходзіць у свае жылыя памяшканні, дазваляць або забараняць азнаямленне з атрыбутамі прыватнага жыцця (памерам заробку, нумарамі тэлефонаў, адрасам электроннай пошты, наяўнасцю маемасці, колам сяброў і г. д.). Інфармацыя аб прыватным жыцці асобы абараняецца законам. У выпадках, прадугледжаных законам, яна прадстаўляецца асобай кампетэнтым дзяржаўным органам, якія абавязаны забяспечыць яе канфідэнцыяльнасць.

Натуральныя правы знаходзяць сваё далейшае развіцце ў асабістых немаёмасных правах асобы: праве на ўласнае выяўленне, уласнае імя, права самастойна вызначаць свой подпіс як знак уласнай ідэнтыфікацыі, права змяняць свой знешні воблік пры дапамозе касметычных сродкаў або касметалагічнай хірургіі і інш.

Сфера натуральных правоў асобым чынам падвяргаецца прававому рэгуляванню. Толькі найбольш важныя аспекты натуральных правоў фіксуюцца ў нарматыўных прававых актах, астатнія застаюцца ў межах аўтаномнай волі асобы.

У сучасны перыяд, у эпоху электранізацыі ўсяго жыцця асобы, недатыкальнасць натуральных правоў фактычна залежыць ад магчамасці замацавання на матэрыяльным носьбіце інфармацыі аб прыватным жыцці. Таму недатыкальнасць прыватнага жыцця – гэта ў значнай ступені недатыкальнасць інфармацыі аб ім. Максімальная гарантыя – адсутнасць зафіксаванай інфармацыі аб жыцці чалавека.

Згодна з Законам Рэспублікі Беларусь ад 21 ліпеня 2008 г. № 418-З «Аб рэгістры насельніцтва» [10] у Рэспубліцы Беларусь з 2013 г. ствараецца рэгістр насельніцтва, які прадстаўляе сабой дзяржаўную цэнтралізаваную аўтаматызаваную інфармацыйную сістэму, аснову якой складае база персанальных дадзеных грамадзян, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, што пастаянна пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

У рэгістры насельніцтва будзе ўтрымлівацца шырокі спектр інфармацыі аб жыцці асобы. Пры гэтым галоўным крытэрыем ідэнтыфікацыі чалавека абрана не ўласнае імя чалавека, а яго персанальны (ідэнтыфікацыйны) нумар. Пад апошнім разумеецца літарна-лічбавая паслядоўнасць, якая з'яўляецца асноўнай ідэнтыфікацыйнай прыкметай асобы ў працэсе ўнясення яе персанальных дадзеных у рэгістр, іх актуалізацыі, выключэння, захоўвання, аднаўлення, прадастаўлення, выкарыстання і абароны. Ідэнтыфікацыйны нумар уносіцца ў пашпарт асобы (зараз – асабісты нумар) і застаецца нязменлівым на працягу ўсяго яе жыцця.

На наш погляд, краіна, якая перажыла рэпрэсіі 30-х гг. XX ст., жахі Вялікай Айчыннай вайны, павінна вельмі асцярожна ўжываць усялякія

сінтэтычныя (ненатуральныя), абязлічаныя крытэрыі ідэнтыфікацыі чалавека, бо такая практыка шырока выкарыстоўвалася ў нацысцкіх і сталінскіх лагерах, і болем можа адазвацца ў сэрцах людзей.

Руская Праваслаўная Царква небеспадстаўна выказвае сур'ёзную заклапочанасць жаданнем дзяржавы стварыць электронную базу дадзеных інфармацыі аб асобе і ўвесці ідэнтыфікацыйныя нумары: «… стварэнне і аб'яднанне масіваў асабістай інфармацыі, а таксама развіццё электронных сродкаў апазнання асобы ўтойвае ў сабе нямала небяспекі. Узрастае залежнасць чалавека ад непазбежных тэхнічных збояў, памылак, нядбайнасці персанала ці ўмяшальніцтва злаўмыснікаў. Не выключана магчымасць централізаванага збору дадзеных аб прыватным жыцці грамадзян і аб іх перакананнях. Гэта стварае пагрозу правам і свабодзе асобы, робіць магчымым татальны кантроль за жыццём чалавека, у тым ліку за яго светапоглядам. Такое развіццё падзей узмацняе небяспеку прадузятых адносін да чалавека на падставе яго рэлігійных, палітычных і іншых поглядаў <...> Нельга ў сістэмах уліку прысвойваць людзям нейкі нумар, які будзе выкарыстоўвацца замест імя. Падобна нумару пашпарта нумары ўліку могуць адносіцца не да асобы, а да дакумента ці запісу ў базе дадзеных» [13].

У рэгістры насельніцтва будуць утрымлівацца, акрамя агульнавядомых звестак (напрыклад, імя чалавека, пол, дата і месца нараджэння, месца жыхарства, грамадзянства, фатаграфія (лічбавы партрэт), дата смерці, прызнанне на падставе рашэння суда недзеяздольным, пашпартныя рэквізіты і г. д.), звесткі аб прыватным жыцці асобы: яго родных, сямейным становішчы, дзецях, групе крыві, адукацыі (назва ВНУ, месца, год яе заканчэння, атрыманая спецыяльнасць, навуковая ступень (званне)), прафесійнай дзейнасці (месца працы, даты працаўладкавання і звальнення, статус безпрацоўнага, дадзеныя аб стварэнні або ўдзеле ў складзе юрыдычнай асобы), пенсіі, налогавых абавязках, воінскім абавязку, прыжыццёвай забароне на ўзяцце органаў для трансплантылогіі, месцы пахавання і інш. Рэгістр насельніцтва будзе весціся на электронным носьбіце.

Збіранне і фіксацыя інфармацыі аб прыватным жыцці асобы ажыццяўляецца па розных накірунках. Адны з іх рэгламентаваны нарматыўнымі прававымі актамі і рэалізуюцца дзяржаўнымі органамі, іншыя – дзяржаўнымі і недзяржаўнымі арганізацыямі ў працэсе сваей прафесійнай, фінансава-гаспадарчай дзейнасці.

Па Указу Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 1 лютага 2010 г. № 60 «Аб мерах па ўдасканаленню выкарыстання нацыянальнага сягмента сеткі Інтэрнэт» [8] пастаўшчыкі інтэрнэт-паслуг абавязаны ажыццяўляць ідэнтыфікацыю абаненцкіх прылад пры аказанні інтэрнэт-паслуг, улік і захоўванне звестак аб абаненцкіх прыладах, а таксама аб аказаных інтэрнэт-паслугах; уласнікі пунктаў калектыўнага карыстання інтэрнэт-паслугамі – ідэнтыфікацыю карыстальнікаў інтэрнэт-паслуг. Пад прыкрыццём гэтага

Указа могуць збірацца звесткі аб сайтах, якія наведала асаба, і аб інфармацыі, атраманай з іх.

Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 3 верасня 2010 г. № 454 «Аб мерах, накіраваных на забеспячэнне бяспекі дарожнага руху з выкарыстаннем спецыяльных тэхнічных сродкаў» [9] узаконіў магчымасць фота-, кіна-, відэафіксацыі транспартных сродкаў, якія перавышаюць хуткасны рэжым. Разам з тым выкарыстанне тэхнічных сродкаў фіксацыі дарожнага руху дае магчымасць атрымоўваць інфармацыю аб прыватным жыцці чалавека, які правіла дарожнага руху не парушае: фіксацыя твару пасажыра ў аўтамабілі, фіксацыя аўтамабіля, які рухаецца побач з правапарушальнікам, выкарыстанне тэхнічных сродкаў у рэжыме бесперапыннага збору дадзеных і г. д.

Усё большае распаўсюджванне набывае відэафіксацыя падзей на вуліцах горада, у метрапалітэне, каля магазінаў, банкаўскіх устаноў, на скрыжаваннях дарог, у будынках дзяржаўных і недзяржаўных устаноў (бальніцах, паліклініках, дзіцячых садках, навучальных установах), у дварах шматпавярховых дамоў. Відэакамеры ўсталяваны ў касах банкаў, магазінаў, вакзалаў, каля банкаматаў і ў іншых месцах, дзе адбываюцца грашовыя разлікі. Адначасова можа весціся аўдыёзапіс размовы чалавека. Уласнікі кватэр, жылых дамоў усё часцей звяртаюцца за аховай сваёй маёмасці, у тым ліку за ўстаноўкай сродкаў фота-, відэафіксацыі падзей у кватэры і на лесвічнай пляцоўцы, да кампетэнтных дзяржаўных устаноў, у якіх накопліваюцца звесткі аб жыцці гэтых асоб (выхад з дому, вяртанне дадому і інш.).

На падставе Закона Рэспублікі Беларусь ад 4 лістапада 2003 г. № 236-З «Аб дзяржаўнай дактыласкапічнай рэгістрацыі» [3] у краіне фактычна праводзіцца ўсеагульная дактыласкапія мужчынскага насельніцтва, а таксама некаторых катэгорый жаночага. Як следства, фарміруецца электронны банк дадзеных адпячаткаў пальцаў грамадзян.

У фінансава-эканамічнай сферы дзяржава ставіць сваёй мэтай пераход на безнаяўны разлік не толькі паміж юрыдычнымі асобамі, але і з удзелам грамадзян як найбольш зручны і празрысты спосаб ажыццяўлення эканамічнага абароту. Пры рэалізацыі грашова-крэдытнай палітыкі Нацыянальны банк Беларусі прадпрымае актыўныя меры па зніжэнні аб'ёму наяўных грашовых сродкаў у эканоміцы краіны. Замест іх прапаноўваюцца так званыя электронныя грошы – адзінкі кошту, якія захоўваюцца ў электронным выглядзе, прымаюцца ў якасці сродку плацяжу пры ажыццяўленні разлікаў і выяўляюць суму безумоўнага і бязводзыўнага абавязацельства эмітэнта па пагашэнні дадзеных адзінак кошту любой асобе, якая прад'явіць іх для пагашэння [11]. Грамадзяне разлічваюцца электроннымі грашыма пры дапамозе пластыкавых картак і іншых праграмна-тэхнічных прылад.

Па звестках Нацыянальнага банка Беларусі, толькі за III квартал 2010 г. на тэрыторыі краіны здзейснена больш за 340,0 млн аперацый з выкарыстаннем банкаўскіх пластыкавых картак у беларускіх рублях [12].

Плацеж электроннымі грашыма можа даць звесткі, кім і дзе ён быў зроблены (у якім магазіне, касе і г. д.), у які час адбыўся, што асоба набыла, які кошт набытай рэчы і інш. Гэтая інфармацыя аб прыватным жыцці чалавека адлюстроўваецца на электронным носьбіце і можа захоўвацца даволі працяглы час.

Другімі накірункамі збору звестак аб фінансова-эканамічным жыцці асобы з'яўляюцца фарміраванне ў Нацыянальным банку крэдытных гісторый на грамадзян [6], у падатковых органах – банка дадзеных аб заробку [2], у арганізацыях па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры – адзінага дзяржаўнага рэгістра нерухомай маёмасці [4], у дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі – электроннага банка дадзеных транспартных сродкаў [5], стварэнне сістэмы бесперапыннага маніторынга фінансавых аперацый, якія выклікаюць падазрэнне на легалізацыю грашовых сродкаў, атрыманых злачынным шляхам [7]. Акрамя гэтага, уласныя банкі дадзеных, якія ўтрымліваюць інфармацыю аб прыватным жыцці асобы, маюць тэлефонныя, у тым ліку сотавыя, аператары, жыллёва-эксплуатацыйныя службы і інш. Часам з-за нядбайных адносін да сваіх службовых абавязкаў ці пасля выкрадання або хакерскіх атак на электронныя рэсурсы адпаведных устаноў такія электронныя банкі дадзеных аказваюцца ў свабодным доступе і прадаюцца на мясцовых рынках, распаўсюджваюцца праз Інтэрнэт.

Фарміраванне электроннай прасторы зрабіла магчымым ажыццяўленне такіх дзяржаўных праграм, як электронны ўрад, прынцып «аднаго акна», калі асобе для вырашэння пэўнай праблемы непатрэбна збіраць даведкі, дакументы, іншыя паперы. Дастаткова звярнуцца да электроннага ўрада ці ў «адно акно» з заявай, і ўсю неабходную інфармацыю дзяржаўны орган атрымае са сваіх электронных банкаў дадзеных самастойна. Звычайна ўкараненне падобных сістэм адносін «дзяржава–грамадзянін» абумоўліваецца клопатам аб асобе, яе правах і свабодах, неабходнасцю барацьбы з карупцыяй, бюракратызмам і іншымі негатыўнамі з'явамі грамадства. На жаль, пытанне аб недатыкальнасці прыватнага жыцця чалавека пры гэтам альбо наогул не ставіцца, альбо разглядаецца ў спрошчаным аспекце праз стварэнне шматузроўневай сістэмы абароны гэтых банкаў дадзеных.

Развіццё тэхнікі і тэхналогій, з аднаго боку, і стварэнне заканадаўчай асновы для іх выкарыстання, з другога, прывялі да такога становішча, што літаральна па пальцах можна пералічыць месцы, дзе асоба застаецца не пад прыглядам відэавока.

Такім чынам, недатыкальнасць натуральных правоў, прыватнага жыцця асобы аказалася пад пагрозай з-за прычыны стварэння разнастайных

банкаў дадзеных аб жыцці асобы, якія маюць тэндэнцыю да зліцця, што ў канчатковым выніку можа прывесці да ўзнікнення аднаго ўніверсальнага банка дадзеных, у якім будуць утрымлівацца ўсе звесткі аб усіх сферах жыцця асобы.

Сучасны этап развіцця грамадства сведчыць аб фарміраванні так званай «татальнай дзяржавы», ці дзяржавы татальнага кантролю. Пад ёй можна разумець дзяржаву, якая падвяргае прававому рэгуляванню самае шырокае кола грамадскіх адносін у палітычнай, эканамічнай, сацыяльнай, культурнай, гуманітарнай сферах жыцця (у тым ліку прыватнага) асобы, уводзіць разнастайныя сістэмы фізічнага і электроннага кантролю асобы, стварае механізмы суцэльнага збору, сістэматызацыі, захоўвання і выкарыстання інфармацыі аб асобе, яе жыццядзейнасці.

Татальная дзяржава не тоесна таталітарнай дзяржаве. Шматлікія сучасныя дэмакратычныя дзяржавы зацікаўлены ў атрыманні і прымнажэнні як мага большага аб'ёму звестак аб жыцці сваіх грамадзян і ідуць па шляху стварэння татальных дзяржаў. Разам з тым неабходна адзначыць, што татальная дзяржава, якая злоўжывае інфармацыяй аб прыватным жыцці асобы і гэтым парушае прынцып недатыкальнасці натуральных правоў, вельмі проста можа пераўтварыцца ў таталітарную.

Татальная дзяржава, на наш погляд, характарызуецца:

- прававой рэгламентацыяй максімальна шырокага кола грамадскіх адносін, у тым ліку адносін асабістага характару;
- актыўным развіццём і ўкараненнем тэхнічных сродкаў суцэльнага збору і фіксацыі інфармацыі;
- прымнажэннем і сістэматызацыяй збіраемай інфармацыі аб жыцці асобы для эфектыўнага яе выкарыстання праз стварэнне сістэмы электронных банкаў дадзеных з наступным аб'яднаннем розных банкаў дадзеных у адзін;
- распрацоўкай механізмаў «нон-стоп» назірання праз створаныя сістэмы з магчымасцю фарміравання храналагічнай карткі жыцця асобы за адпаведны час (дзень, тыдзень, месяц і г. д.);
- стварэннем спецыялізаванага апарату дзяржаўных органаў і арганізацый, якія ажыццяўляюць функцыі па зборы, сістэматызацыі, захаванні і выкарыстанні інфармацыі аб жыцці асобы.

## Літаратура

1. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 года са зм. і дап. – Мінск: Беларусь, 2004. – 95 с.
2. Налоговый кодекс Республики Беларусь (Особенная часть) от 29 декабря 2009 г. № 71-З // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2010. – № 4. – 2/1623.
3. О государственной дактилоскопической регистрации: Закон Республики Беларусь от 4 ноября 2003 г. № 236-З // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2003. – № 124. – 2/985.

4. О государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним: Закон Республики Беларусь от 22 июля 2002 г. № 133-З // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2002. – № 87. – 2/882.

5. О дорожном движении: Закон Республики Беларусь от 5 января 2008 г. № 313-З // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2008. – № 14. – 2/1410.

6. О кредитных историях: Закон Республики Беларусь от 10 ноября 2008 г. № 441-З // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2008. – № 275. – 2/1538.

7. О мерах по предотвращению легализации доходов, полученных преступным путем, и финансирования террористической деятельности: Закон Республики Беларусь от 19 июля 2000 г. № 426-З // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2000. – № 75. – 2/201.

8. О мерах по совершенствованию использования национального сегмента сети Интернет: Указ Президента Республики Беларусь от 1 февраля 2010 г. № 60 // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2010. – № 29. – 1/11368.

9. О мерах, направленных на обеспечение безопасности дорожного движения с использованием специальных технических средств: Указ Президента Республики Беларусь от 3 сентября 2010 г. № 454 // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2010. – № 213. – 1/11916.

10. О регистре населения: Закон Республики Беларусь от 21 июля 2008 г. № 418-З // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2008. – № 184. – 2/1515.

11. Об утверждении Правил осуществления операций с электронными деньгами: постановление Правления Национального банка Республики Беларусь от 16 февраля 2007 г. № 52 // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2007. – № 84. – 8/16081.

12. Развитие в Республике Беларусь рынка банковских пластиковых карточек // http://www.nbrb.by/payment/PlasticCards/. – Дата доступа. 30.12.2010.

13. Сообщение Священного Синода Русской Православной Церкви по поводу перехода к системе электронной идентификации людей от 17 октября 2005 г. // http://www.patriarchia.ru/db/text/53586.html. – Дата доступа: 28.12.2010.